**УДК 947.6 «1941/1944»**

# ПРЫЦЯГНЕННЕ ЖАНОЧАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ НА ПРЫМУСОВЫЯ РАБОТЫ Ў ГЕРМАНІЮ Ў 1942 – 1944 ГАДАХ

***канд. гіст. навук І.У. НІКАЛАЕВА***
***(Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава)***

*Даследуецца дзейнасць германскіх акупацыйных улад па прыцягненню жаночага насельніцтва Беларусі на прымусовыя работы ў Германію ў 1942 – 1944 гадах. Даследаванне ажыццяўлялася з прыцягненнем матэрыялаў, якія знаходзяцца на захаванні ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўных архівах Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей, а таксама апублікаваных дакументальных крыніц, якія характарызуюць сацыяльна-эканамічныя і ідэалагічныя аспекты нацысцкай палітыкі на акупаванай тэрыторыі Беларусі, раскрываюць работу партыйных і камсамольскіх органаў сярод жаночага насельніцтва ў тыле ворага, адлюстроўваюць удзел жанчын у антыгерманскім супраціўленні. На падставе аналізу дакументаў раскрываецца механізм рэгістрацыі працаздольнага жаночага насельніцтва, нацысцкая практыка мабілізацыі ў рэйх жаночых працоўных рэсурсаў Беларусі, а таксама супраціўленне вярбоўцы ў Германію з боку беларускіх жанчын.*

**Уводзіны.** Адной з неад'емных задач германскага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі стала эксплуатацыя мясцовых працоўных рэсурсаў, адпаведныя рабочыя ўказанні на гэты конт знайшлі сваё адлюстраванне яшчэ ў «Зялёнай папцы» Г. Герынга, падрыхтаванай да нападу на Савецкі Саюз. Аднак к 1942 году, калі перспектыва хуткага заканчэння вайны стала немагчымай, кіраўніцтва Германіі вымушана было звярнуцца да больш шырокага, чым запланаванае раней, выкарыстання працоўных рэзерваў усходніх акупаваных тэрыторый. У выніку няўдач нямецкіх войск на Усходнім фронце і складанай унутрыэканамічнай сітуацыі ў рэйху важным аспектам эканамічнай палітыкі акупацыйных улад стаў вываз грамадзян рэспублікі на прымусовыя работы ў Германію, што напярэдадні вайны не ўваходзіла ў планы нацысцкага кіраўніцтва як па ідэалагічных, так і эканамічных меркаваннях. Пры гэтым нацысты не маглі не прыняць пад увагу той факт, што ў выніку праведзенай эвакуацыі ў савецкі тыл, мабілізацыі мужчын прызыўнога ўзросту ў Чырвоную Армію, а таксама ўключэння значнай часткі мужчынскага кантынгенту ў партызанскую барацьбу пераважную большасць дарослага насельніцтва акупаваных тэрыторый складалі жанчыны, якія пачалі разглядацца нацысцкімі правячымі коламі ў якасці значнай крыніцы папаўнення так неабходнай рабочай сілы. Прымусовы вываз жанчын рэспублікі на работу ў Германію стаў для германскіх улад адным з галоўных прынцыпаў рэалізацыі акупацыйнай палітыкі ў дачыненні да гэтай катэгорыі насельніцтва захопленых абласцей.

Нягледзячы на значны інтарэс да тэмы прымусовай працы замежных рабочых у трэцім рэйху падчас другой сусветнай вайны, гістарыяграфічны аналіз праблемы вярбоўкі жаночага насельніцтва Беларусі на работы ў Германію сведчыць, што да гэтага часу яна не стала прадметам самастойнага даследавання. Некаторыя яе аспекты знайшлі сваё адлюстраванне ў працах сучасных айчынных гісторыкаў у кантэксце аналізу германскай эканамічнай палітыкі ў сферы выкарыстання працоўных рэсурсаў рэспублікі [1; 2]. Матэрыял, які асвятляе пытанні прымусовай мабілізацыі беларускіх жанчын і дзяўчат у Германію, утрымліваецца ў гісторыка-аналітычным даследаванні «Белорусские остарбайтеры», аўтары якога сярод іншага засяроджваюць сваю ўвагу на акцыі па вярбоўцы і выкарыстанні ўсходніх работніц у хатняй гаспадарцы немцаў, звяртаюцца да такога аспекту, як колькасць вывезеных у Германію [3].

У плане разглядаемай праблемы пэўны інтарэс прадстаўляе агляд нямецкамоўнай гістарыяграфіі гісторыі остарбайтэраў, зроблены А.М. Белановіч, якая паспрабавала надаць тэме прымусовага выкарыстання працы жанчын-остарбайтэраў статус асобнай праблемы. Між тым увага даследчыцы акцэнтуецца на становішчы жанчын толькі на тэрыторыі рэйха [4]. Аўтарам дадзенага артыкула ў сваю чаргу зроблена спроба прааналізаваць дзейнасць акупацыйных германскіх улад непасрэдна па прыцягненню жаночага насельніцтва Беларусі на прымусовыя работы ў Германію. На падставе аналізу архіўных матэрыялаў і апублікаваных дакументальных крыніц раскрыты механізм рэгістрацыі працаздольнага жаночага насельніцтва, ахарактарызавана нацысцкая практыка мабілізацыі ў рэйх жаночых працоўных рэсурсаў Беларусі, а таксама супраціўленне вярбоўцы з боку саміх жанчын.

**Асноўная частка.** Германскія ўлады, якія з ідэалагічных меркаванняў абмяжоўвалі працоўны ўдзел нямецкіх жанчын у ваеннай эканоміцы, разам з тым разглядалі жаночае насельніцтва Беларусі ў якасці магчымай крыніцы папаўнення працоўных рэсурсаў першапачаткова і прыступілі да яго ўліку з першых дзён акупацыі. З мэтай эфектыўнага выкарыстання працоўных рэзерваў Беларусі спецыяльна

створаныя аддзелы і біржы працы павінны былі ў кароткі тэрмін правесці статыстычны ўлік усіх жыхароў акупаваных тэрыторый, асобна вылучыўшы іх працаздольную частку. Пры гэтым прадугледжвалася размежаванне рабочай сілы паводле полу. Так, у Вілейцы восенню 1941 года статыстычны ўлік рабочай сілы праводзіўся двума пасрэдніцкімі бюро: мужчынскім і жаночым [5, спр. 978, арк. 170]. З мэтай прадухіліць нез'яўленне насельніцтва на рэгістрацыю мясцовай адміністрацыяй уводзіліся разнастайныя штрафныя санкцыі. Так, напрыклад, усе жыхары Навагрудскай акругі ва ўзросце ад 14 да 60 год, згодна распараджэнню акруговага камісара, павінны былі зарэгістравацца да 10 лютага 1942 года, паведаміўшы звесткі пра сябе ў наступнай форме: месца жыхырства, дата нараджэння, сямейнае становішча, колькасць малалетніх дзяцей, прафесія і асвета. Таго, хто не зрабіў гэтага да вызначанага тэрміну, чакаў грашовы штраф памерам да 1000 рублёў або арышт [6, арк. 12].

Рэгістрацыя жаночага насельніцтва і ўдакладненне папярэдніх даных пра колькасць працаздольных жанчын узмоцнена праводзілася ў 1942 годзе, калі ва ўмовах зрыву планаў «маланкавай вайны» і складанага ўнутрыэканамічнага становішча ў рэйху кіраўніцтва Германіі вымушана было звярнуцца да больш шырокага выкарыстання працоўных рэсурсаў усходніх акупаваных тэрыторый як у мясцовай, так і ў германскай вытворчасці. Так, на тэрыторыі Мінскай акругі збор статыстычных даных на пачатку 1942 года праводзіўся ў некалькі этапаў. Спачатку, з 19.01.1942 па 26.01.1942, біржы працы павінны былі сабраць звесткі аб беспрацоўных працаздольных мужчынах, пасля чаго неабходна было распачаць рэгістрацыю працаздольных жанчын, якая павінна была закончыцца да 02.02.1942. Падлягала ўліку жаночая рабочая сіла ад 15 да 50 год [7, спр. 173, арк. 229, 244].

Аддзелы працоўнага кіравання падзялялі мясцовых жанчын на тых, якія мелі сем'і, і на тых, якія не былі замужам – апошніх можна было лёгка накіроўваць на любыя работы на тэрыторыі Беларусі, а таксама ў Германію. Рэгістрацыя на біржах прадугледжвала абавязковае ўказанне жанчынамі іх спецыяльнасці. У далейшым акупацыйныя ўлады фіксавалі колькасць працаздольнага насельніцтва па прафесійных групах. Да прыкладу, у Мінскай акрузе ўлік працаздольных жанчын ажыццяўляўся ў адпаведнасці з агульнапрынятым спісам груп прафесій для прызначэння на работы, што ўключаў у сябе 28 пунктаў, кожны з якіх утрымліваў пералік канкрэтных спецыяльнасцей, аб'яднаных у дадзенай групе. Напрыклад, сярод спецыялістаў транспарту асобна вылучаліся вагонаважатыя, кандуктары, шафёры, стрэлачніцы і г.д. [7, спр. 173, арк. 247 – 253; спр. 403, арк. 6]. Такая дэталёвая статыстыка па прафесіях дазваляла аператыўна рэагаваць на запыт гарадскіх (раённых) упраўленняў, нямецкіх воінскіх часцей, разнастайных грамадзянскіх устаноў і арганізацый, зацікаўленых прадпрыемстваў аб рабочых канкрэтных спецыяльнасцей, а таксама задавальняць патрэбы рэйха ў рабочай сіле.

З пашырэннем у 1942 годзе практыкі выкарыстання працы замежных рабочых у інтарэсах ваеннай эканомікі Германіі як на акупаванай тэрыторыі, так і ў рэйху, погляды германскага кіраўніцтва на месца і значэнне жаночай рабочай сілы Беларусі пэўным чынам змяніліся. Ва ўмовах дэфіцыту мужчынскіх працоўных рэсурсаў, калі асноўную частку дарослага насельніцтва падпарадкаваных тэрыторый складалі жанчыны, выкарыстанне жаночых рэзерваў набыло выключнае значэнне. Пазіцыя нямецкага кіраўніцтва на гэты конт знайшла адлюстраванне ў справаздачы найбліжэйшага памочніка рэйхсміністра па занятых усходніх абласцях маёра Мюлера А. Розенбергу. Аналізуючы сітуацыю з мясцовай рабочай сілай у аператыўнай зоне «Цэнтр», дзе па падліках бірж працы жанчыны складалі больш за 60 % ад агульнай колькасці насельніцтва, старэйшага за 14 год, Мюлер адзначаў: «Жанчын гэтай краіны можна разглядаць як паўнацэнную рабочую сілу, таму што яны не толькі прывыклі да цяжкіх мужчынскіх работ, але і больш старанныя за мужчын» [5, спр. 973, арк. 43 – 44].

Калі вясной 1942 года нямецкія ўлады прыступілі да актыўнай мабілізацыі насельніцтва акупаваных тэрыторый Савецкага Саюза на работу ў рэйх, мясцовыя структуры па кіраванні працоўнай сілай імкнуліся па магчымасці максімальна прыцягнуць жаночую працоўную сілу для забеспячэння эканомікі Германіі рабочымі рукамі. «Кожная адзінка рабочай сілы павінна быць выкарыстана па свайму прызначэнню, – адзначаў камандуючы цэнтральнай армейскай групай, – з-за кожнай дзяўчыны, якая засталася ў раёне аперацыі, мы вымушаны прыцягваць жонак франтавікоў на работу ў ваеннай прамысловасці» [8, арк. 56].

Вярбовачная кампанія па адпраўцы жаночага насельніцтва ў германскі рэйх праходзіла выключна інтэнсіўна, і ўжо на 31 мая 1942 года сярод грамадзянскага насельніцтва, вывезенага з савецкай акупаванай тэрыторыі на работы ў рэйх, па даных генеральнага ўпаўнаважанага па выкарыстанні працоўнай сілы гаўляйтэра Ф. Заўкеля налічвалася 198 тыс. жанчын [9, кн. 1, с. 133]. Першапачаткова вярбоўка насельніцтва ў Германію вялася на добраахвотнай аснове, аднак ужо з лета пачынаецца прымусовая мабілізацыя мясцовай жаночай працоўнай сілы. У спецыяльных разнарадках па валасцях указвалася, колькі чалавек і ў які тэрмін воласць павінна была паставіць. Так, згодна распараджэнню начальніка Крупскай райуправы ад 3 чэрвеня 1942 года, бургамістр Бобрскай воласці павінен быў выдзеліць 46 асоб жаночага полу ва ўзросце ад 17 да 45 год для адпраўкі ў рэйх, 40 жанчын прадпісвалася прадставіць з Крупскай воласці [10, спр. 1, арк. 182; спр. 11, арк. 183].

Упаўнаважаны рэйхсміністра па занятых усходніх абласцях пры камандуючым тылам групы армій «Цэнтр» маёр Мюлер, аналізуючы сітуацыю з мясцовай рабочай сілай у аператыўнай зоне, у справаздачы ад 8 кастрычніка 1942 года адзначаў, што з 2 421 510 зарэгістраваных працаздольных жанчын у якасці рэзерву для вярбоўкі на работы можна разглядаць 2 млн. чалавек [5, спр. 973, арк. 43 – 44].

У першую чаргу ў спісы для адпраўкі на работы ў Германію ўносіліся працаздольныя жанчыны, якія не былі занятыя на пастаянных работах, а таксама тыя, хто прыехаў на месца жыхарства пасля 22 чэрвеня 1941 года. Кандыдатамі для адпраўкі ў рэйх былі таксама нядобранадзейныя з пункту гледжання акупантаў грамадзяне. Згодна з пастановай начальніка Езярышчанскага раёна ад 25 красавіка 1942 года для абавязковай рэгістрацыі ва ўправу павінны былі з’явіцца жанчыны – былыя камсамолкі і члены партыі, якія пражывалі на тэрыторыі адпаведных валасцей [5, спр. 339, арк. 10 – 11]. Пад пільнай увагай гітлераўцаў у гэтай сувязі аказаліся таксама жонкі былых партыйных і савецкіх работнікаў. У прыватнасці, Брэсцкі акруговы камісар у сакавіку 1942 года адзначыў: «Бальшавіцкія жонкі, што засталіся тут, якія не стануць нашымі прыхільніцамі, будуць накіраваны на работы ў Германію» [9, кн. 1, с. 65].

Для работы ў рэйх забаранялася вербаваць жанчын з маленькімі дзецьмі, а таксама цяжарных. Аднак, калі ў другой палове 1943 года дэпартацыя насельніцтва асабліва ўзмацнілася, галоўнае камандаванне армейскай групай хадайнічала аб адмене пастановы, згодна з якой цяжарныя жанчыны не выкарыстоўваліся на работах у Германіі. Такі крок яно тлумачыла жаданнем «не дапусціць таго, каб жанчыны злоўжывалі гэтым законам і не мелі падставы не быць мабілізаванымі» [8, арк. 62].

Адпраўленыя ў рэйх усходнія работніцы выкарыстоўваліся на будаўніцтве абарончых збудаванняў, у сельскай гаспадарцы і ваеннай прамысловасці, а з верасня 1942 года і ў хатняй гаспадарцы немцаў у якасці абслуговага персаналу. У адпаведнасці з указаннем рэйхсфюрэра СС Гімлера аб выкарыстанні жаночага рабочага персаналу ў хатняй гаспадарцы Германіі ад 10 верасня 1942 года, выкарыстанне ўсходніх работніц у нямецкай гаспадарцы дазвалялася толькі «пасля задавальнення патрэб у рабочай сіле прадпрыемстваў узбраення і сельскай гаспадаркі» [9, кн. 1, с. 165]. Да таго ж для падобнай работы дапускаліся толькі тыя асобы жаночага полу ва ўзросце ад 15 да 35 год, «знешні выгляд якіх расава адпавядаў знешняму выгляду нямецкіх жанчын» [9, кн. 1, с. 166].

Распараджэнне Заўкеля ад 8 верасня 1942 года ўказвала на неабходнасць даставіць у Германію 400 тыс. «памочніц па гаспадарцы»: 250 тыс. – з рэйхскамісарыятаў «Остланд» і «Украіна», 150 тыс. – з аператыўных армейскіх зон [3, с. 53 – 54]. Аднак акцыя па мабілізацыі хатніх гаспадынь у канцы 1942 года не мела поспеху. Для генеральнай акругі Беларусь была ўстаноўлена квота ў 30 тыс., а да канца лістапада 1942 года змаглі мабілізаваць, па звестках паліцыі бяспекі і СД, каля 100 чалавек, якія прайшлі «расавую селекцыю на ўсходзе» [9, кн. 2, с. 14].

Абвешчаная фюрэрам ў 1943 годзе татальная мабілізацыя ў Германіі матэрыяльных і людскіх рэсурсаў знайшла працяг у палітыцы масавай дэпартацыі працоўнай сілы з акупаваных тэрыторый. Да гэтага часу рэзерв мужчынскай рабочай сілы быў амаль цалкам выкарыстаны, што абумовіла татальны ахоп жаночай працоўнай сілы. У пошуку новых крыніц папаўнення працоўных рэсурсаў акупацыйная адміністрацыя рэкамендавала кіраўнікам усіх устаноў і прадпрыемстваў прыцягваць жанчын да работ, якія раней выконваліся мужчынамі [11, арк. 11]. У сваю чаргу старшы прапагандыст Цэнтральнага бюро прафсаюзаў Беларусі С. Калядка заўважаў, што забяспечыўшы працай на месцы ўсіх жанчын з дзецьмі, астатніх, на яго думку, можна было разглядаць як кандыдатаў на выезд «куды толькі спатрэбіцца» [9, кн. 2, с. 167].

Шырокі размах атрымала практыка захопу працоўнай сілы падчас правядзення карных аперацый супраць партызан. У сваёй дзейнасці акупацыйныя ўлады кіраваліся сакрэтнай дырэктывай рэйхсмаршала Г. Герынга ад 26 кастрычніка 1942 года аб тым, што ўсе мужчыны і жанчыны акупаванай тэрыторыі, якія могуць быць выкарыстаны ў якой-небудзь форме як працоўная сіла, павінны прымусова мабілізоўвацца і накіроўвацца ў распараджэнне генеральнага ўпаўнаважанага па выкарыстанні працоўнай сілы для накіравання іх на тылавыя работы ці ў Германію [3, с. 58]. Зыходзячы з загадаў і дырэктыў аб татальнай мабілізацыі ў штабе 3-й танкавай арміі групы армій «Цэнтр» у лютым 1943 года была распрацавана інструкцыя для воінскіх часцей, якія ўдзельнічалі ў правядзенні карных аперацый. У адпаведнасці з ёй воінскім часцям прадпісвалася разбіваць мабілізаванае жаночае насельніцтва на дзве групы. Асобна вылучаліся працаздольныя жанчыны ад 15 да 60 год, сярод іх таксама маці з дзецьмі, калі з іх прынамсі палова, старэйшая за 10 год, якія пад аховай павінны былі накіроўвацца на бліжэйшы зборны пункт рабочай сілы. Астатніх жанчын разам з іх дзецьмі прадпісвалася адпраўляць для новага пасялення ў асобна вызначаных у загадзе абшчынах. Для апошніх вызначаліся вёскі, размешчаныя далёка ад галоўных магістраляў [9, кн. 2, с. 41 – 42]. Такім чынам, патрэбнасць у рабочай сіле часткова была пакрыта шляхам аблаў і карных акцый. Падчас аперацый пад кодавымі назвамі «Котбус» (май – чэрвень 1943) было захоплена ў якасці працоўнай сілы 1506 жанчын, «Герман» (ліпень – жнівень 1943) – 7 701, «Фрыц» (верасень – кастрычнік 1943) – 3 778 [12, с. 92 – 93, 106, 11 – 112]. Аднак трэба адзначыць, што прымя-

ненне сілавых метадаў не давала вялікіх станоўчых вынікаў, бо названыя лічбы былі значна меншыя, чым запланаваныя.

Жаночая працоўная сіла заставалася аб'ектам самага пільнага нагляду ў ходзе эвакуацыйных мерапрыемстваў праціўніка, калі ўсё працаздольнае насельніцтва прымусова перамяшчалася немцамі на Захад падчас адступлення з тэрыторыі Беларусі. Эвакуіраванае жаночае насельніцтва ў далейшым вывозілася ў рэйх ці выкарыстоўвалася на работах на новым месцы жыхарства ў інтарэсах вермахта. Прымусовая эвакуацыя суправаджалася выкарыстаннем выключных мер па захопу працаздольнага насельніцтва падчас правядзення карных аперацый. Так, падчас ажыццяўлення летам 1944 года шэрагу аперацый супраць партызан на тэрыторыі 3-й танкавай арміі групы армій «Цэнтр» каля 30 % усіх захопленых жанчын былі накіраваны на работу ў рэйх [9, кн. 2, с. 356]. Разам з тым, нягледзячы на ўсе намаганні акупантаў, у тым ліку меўшыя месца агітацыйна-прапагандысцкія мерапрыемствы, жанчыны Беларусі актыўна супраціўляліся вярбоўцы ў Германію, што выяўлялася ў нез'яўленні на зборныя пункты, уцёках на шляху руху саставаў з рабочымі. Мабілізаваныя рабілі захады па сімуляцыі разнастайных захворванняў, подкупе супрацоўнікаў бірж працы. Жанчыны скарыстоўвалі любую магчымасць пазбегнуць адпраўкі ў Германію, нават фіктыўны шлюб з немцамі ці прадстаўнікамі мясцовай калабарацыйнай адміністрацыі. З вясны 1944 года ў генеральнай акрузе дзейнічала пастанова, якая забараняла шлюбы дзяўчат у першую чаргу 1925 – 1926 гадоў нараджэння (дакладней узростаў, што падлягалі татальнай мабілізацыі) і вышэй без дазволу камендатуры і прадугледжвала ўскладненне працэдуры рэгістрацыі шлюбных адносін мясцовых жанчын з супрацоўнікамі Службы парадку і добраахвотнікамі нямецкіх вайсковых часцей, бо іх жонкі не падлягалі вывазу ў Германію [13, арк. 40].

Планы германскіх акупантаў парушалі партызаны і падпольшчыкі, якія разгарнулі на захопленай тэрыторыі Беларусі шырокую прапагандысцкую работу з мэтай барацьбы супраць вывазу ў рэйх «усходняй рабочай сілы». З чэрвеня 1942 па сакавік 1943 года Клічаўскі падпольны РК КП(б)Б выпусціў 260 адрасаваных жанчынам лістовак, у якіх выкрываліся сапраўдныя намеры захопнікаў [14, спр. 108, арк. 97]. Толькі за студзень – красавік 1944 года Мінскім падпольным гаркамам ЛКСМБ было выдадзена і распаўсюджана 60 экземпляраў зваротаў да жаночага насельніцтва, якія заклікалі ўхіляцца ад вярбоўкі ў Германію [15, арк. 227]. У шэрагу лістовак і перыядычных выданняў прыводзіліся ўрыўкі з лістоў остарбайтэраў, якія сведчылі пра іх рэальнае становішча ў рэйху [16, арк. 3].

Пераважная большасць беларускіх дзяўчат, усведамляючы сапраўдныя намеры акупацыйных улад, накіроўвалася ў лясы, папаўняючы рады партызан. У сувязі са значным пашырэннем з другой паловы 1943 года нацысцкай практыкі прымусовай мабілізацыі мясцовых жанчын на работы ў рэйх, вышэйшыя партыйныя органы з мэтай выратавання мясцовага насельніцтва абавязвалі кіраўніцтва партызанскіх фарміраванняў «безагаворачна прымаць у партызанскія атрады ўсіх жадаючых незалежна ад полу і ўзбраення» [14, спр. 16, арк. 47]. З ліпеня 1943 да сярэдзіны 1944 года колькасць жанчын толькі ў баявым складзе беларускіх партызан павялічылася ў 5 разоў [17]. Акрамя таго некаторая частка жанчын знаходзіла ратунак для сябе і сваіх дзяцей у грамадзянскіх лагерах, спецыяльна створаных пры партызанскіх атрадах.

**Высновы.** Германская палітыка ў сферы выкарыстання працы жаночага насельніцтва Беларусі была звязана са станам развіцця падзей на савецка-германскім фронце, унутрыэканамічнай сітуацыяй у рэйху і характарызавалася інтэнсіфікацыяй эксплуатацыі жаночых працоўных рэсурсаў. Нацысцкае кіраўніцтва, якое з ідэалагічных меркаванняў абмяжоўвала прыцягненне нямецкіх жанчын да працы ў прамысловасці, разам з тым шырока праводзіла выкарыстанне ў ваеннай эканоміцы Германіі жанчын з акупаванай тэрыторыі Беларусі. Пасля правалу планаў вярбоўкі неабходнай працоўнай сілы на добраахвотнай аснове, органы акупацыйнай адміністрацыі вымушаны былі перайсці да прымусовай мабілізацыі насельніцтва на работу ў Германію. Нягледзячы на маштабныя працоўныя мерапрыемствы акупантаў па вярбоўцы ў рэйх, яны сустрэлі актыўнае супраціўленне з боку мясцовага насельніцтва, большай часткі жанчын і дзяўчат рэспублікі ўдалося пазбегнуць дэпартацыі. Тым не менш у агульнай колькасці остарбайтэраў працэнт жанчын быў даволі вялікі. Па звестках СНК БССР на 30 лістапада 1945 года, з Беларусі ў Германію было адпраўлена 237 947 жанчын, што складае 59,6 % ад усіх беларускіх остарбайтэраў [9, кн. 2, с. 381].

## ЛІТАРАТУРА


1. Новікаў, С.Я. Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941 – 1944 гг. (агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў) / С.Я. Новікаў. – Мінск: МДЛУ, 2002. – 219 с.
2. Гребень, Е.А. Привлечение нацистской Германией граждан Беларуси на принудительные работы (1941 – 1944 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Е.А. Гребень; БГУ. – Минск, 2005. – 19 с.
3. Белорусские остарбайтеры: ист.-аналит. исслед. / Г.Д. Кнатько [и др.]; под ред. Г.Д. Кнатько. – Минск: НАРБ, 2001. – 336 с.

4. Белановіч, А.М. Жаночы лёс остарбайтараў: на прыкладзе нямецкамоўнай гістарыяграфіі / А.М. Белановіч // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., 25 крас. 2008 г. Вып. 7: у 2 кн. Кн. 2; Мінскі дзярж. лінгвіст. ун-т; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: МДЛУ, 2009. – С. 16 – 21.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4683. – Воп. 3. – Спр. 339, 973, 978. Сообщения, указания, объявления, предписания оккупантов, 1941 – 1943 гг.
6. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Фонд 642. – Воп. 1. – Спр. 1. Приказы Новогрудского гебиткомиссара, 1941 – 1944 гг.
7. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Фонд 623. – Воп. 1. – Спр. 173, 403. Приказы, распоряжения, циркуляры Комиссариата Минского округа, бургомистра Минской районной управы, 1941 – 1942 гг.
8. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 33-а. – Спр. 445. Сборник № 2 переведенных документов противника, декабрь 1943 г.
9. Белорусские остарбайтеры: Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию, 1941 – 1944. Документы и материалы: в 2 кн. / сост.: Г.Д. Кнатько [и др.]. – Минск: НАРБ, 1996 – 1997. – Кн. 1: 1941 – 1942. – 1996. – 304 с.; Кн. 2: 1943 – 1944. – 1997. – 472 с.
10. ДАМВ. – Фонд 686. – Воп. 1. – Спр. 1, 11. Приказы и распоряжения Крупского районного управления, 1941 – 1943 гг.
11. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Фонд 2733. – Воп. 1. – Спр. 59. Циркуляры, распоряжения окружного комиссара, приказы Лунинецкого районного управления о привлечении к работе всех трудоспособных женщин.
12. Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941 – 1944. Докум. и материалы / предисл.: И.П. Ховратович и Г.Н. Шевела. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск: Беларусь, 1965. – 464 с.
13. ДАМВ. – Фонд 622. – Воп. 1. – Спр. 1. Приказы и распоряжения бургомистра г. Борисова, 1941 – 1944 гг.
14. НАРБ. – Фонд 1350. – Воп. 1. – Спр. 16, 108. Протоколы заседаний Могилевского обкома КП(б)Б 1943 г. Отчеты Кличевского подпольного РК КП(б)Б.
15. НАРБ. – Фонд 63-п. – Воп. 16. – Спр. 7. Материалы Минского обкома ЛКСМБ, 1943 – 1944 гг.
16. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 2290. – Воп. 2. – Спр. 1. Печатные материалы, изданные советскими и партийными органами, 1941 – 1945 гг.
17. Падлічана па: НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 33-а. – Спр. 524. – Арк. 135; Фонд 3500. – Воп. 12. – Спр. 10. – Арк. 9.

*Паступіў 11.03.2010*

## ATTRACT OF FEMALE POPULATION OF BELARUS FOR COMPULSORY LABOUR IN GERMANY IN 1942 – 1944

***I. NIKALAEVA***

*The article deals with study of the activity of German occupation in the field of attraction of female population of Belarus for compulsory labour in Germany in 1942 – 1944. There are archival materials and public documents which characterize such problems as social-economic and ideological aspects of Nazi policy on the occupied territory, the activity of the Party and Comsomol committees among the female population in the rear of the enemy and women participation in antifascist resistance. On the basis of documents the mechanism of female population registration, Nazi practice of mobilization of female labour reserves in Reich and the resistance to the recruitment in Germany on behalf of Belarusian women are investigated.*